31 июля 262 депутата Национального собрания одобрили конституцию, 75 голосовали против её принятия. «Против» проголосовали ННПП, ННП и Независимые социал-демократы. [6]


1. Конституция Германской империи // Конституции буржуазных государств. М-Л., 1936. – С. 83-115.
2. Космач Г.А. Кризис германского либерализма в годы Веймарской республики: Идеология и политика Немецкой демократ. партии в 1918-1929 гг. – Мн.: Университетское, 1989. – 190 с.
3. Bericht der Sozialdemokratischen Fraktion der Verfassunggebenden Nationalversammlung des Deutschen Reiches Mai 1919 – April 1920 // Protokoll über der Verhandlungen des Parteitages abgehalten in Kassel vom 10. bis 16. Oktober 1920. – Berlin: Buchhandlung Vorwärts. – S. 93-96.
4. Bericht über den Ersten Parteitag der Deutschen Volkspartei am 13. April 1919 in den Akademischen Rosensälen in Jena. Herausgegebenen von der Reichsgeschäftsstelle der Deutschen Volkspartei in Berlin. – Berlin: Buchhandlung Vorwärts. – 114 s.
5. Biographischer Lexikon der Weimarer Republik. – Köln: Verlag Köln, 1997. – 395 s.
6. Braucher K.D. Die Auflösung der Weimarer Republik. – Stuttgart und Dusseldorf: Ring. Verlag, 1957. – 797 s.
7. Die Deutsche Nationalversammlung im Jahre 1919 in ihrer Arbeit für den Aufbau des neuen deutschen Volksstaaten. Hersg. von Geh Justizrat Prof Dr. Ed. Heilfront. Bd. V. – Berlin, 1919. – S. 2845-3970.
8. Die Deutsche Nationalversammlung im Jahre 1919 in ihrer Arbeit für den Aufbau des neuen deutschen Volksstaaten. Hersg. von Geh Justizrat Prof Dr. Ed. Heilfront. Bd. VI. – Berlin, 1919. – S. 3565-4258.
9. Die Deutsche Nationalversammlung im Jahre 1919 in ihrer Arbeit für den Aufbau des neuen deutschen Volksstaaten. Hersg. von Geh Justizrat Prof Dr. Ed. Heilfront. Bd. VII. – Berlin, 1919, – S. 310-455.
10. Deutschnationale Volkspartei (DNVP) // Lexikon zur Parteiengeschichte. Die bürgerlichen und kleinbürgerlichen Parteien und Verbände in Deutschland (1789-1945). In vier Bändern. Band 2. – Köln: Rahl-Rugenstein. Verlag, 1983. – S. 476-528.
11. Deitsche Parteiprogramme Herausgegeben von Wilhelm Mommsen. Ordentlicher Professor für mittlere und neue Geschichte. München: Isar Vrlg., 1960. – 420-428.
12. Deutsche Volkspartei (DVP) // Lexikon zur Parteiengeschichte. Die bürgerlichen und kleinbürgerlichen Parteien und Verbände in Deutschland (1789-1945). In vier Bändern. Band 2. – Köln: Rahl-Rugenstein. Verlag, 1983. – S. 413-446.
13. Forsthof E. Deutsche Geschichte seit 1918 in Dokumenten. – Leipzig: Alfred Kröner Verlag, 1935 – 328 s.
14. Das Kabinett Bauer: 21 Juni 1919 bis 27 März 1920 / Bearb. von A. Golecki, 1980. – 889 s.
15. Treue W. Deutsche Parteiprogramme 1861-1956. 2-te erw. – Göttingen: . Aufl. Göttingen u.a. Muster Schmidt, 1956. – 320 s.
16. Das Zentrum in den Jahren 1919-1923 // Lexikon zur Parteiengeschichte. Die bürgerlichen und kleinbürgerlichen Parteien und Verbände in Deutschland (1789-1945). In vier Bändern. Band 4. – Köln: Rahl-Rugenstein. Verlag, 1983. – S. 552-635.


## МАЛАВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ ВАЕННА-ЭКАНАМІЧНАЙ ГІСТОРЫІ БРЭСТЧЫНЫ (1941—1944 ГГ.)


Новікаў С.Я.

*г. Мінск, МДЛУ*


Вывучэнне ваенна-эканамічнай гісторыі Брэстчыны ў гады германскай акупацыі 1941—44 гг., як паказвае сёнешні стан айчыннай і замежнай гістарычнай навукі, практычна нельга правесці без аналізу арыгінальных дакументаў, перш за ўсё выніковых справаздач гебітскамісараў Брэст-Літоўска, Кобрына, Пінска.

У дадзеным артыкуле чытачу прапануецца вывучэнне згаданых дакументаў з улікам вырашэння толькі некаторых задач, сярод якіх: 1) высвятленне асаблівасцей падзелу тэрыторыі Брэсцкай і Пінскай абласцей паміж рэйхскамісарыятамі Остланд і Украіна скрозь прызму ўтварэння Брэст-Літоўскай, Давыд-Гарадокскай, Кобрынскай, Пінскай і Столінскай акруг; 2) вывучэнне дзейнасці гебітскамісарыятаў Брэст-Літоўска, Кобрына і Пінска па выкананні ваенна-эканамічных дырэктыў у вобласці "вядзення гаспадаркі" на акупаванай тэрыторыі Брэстчыны.

Канец жніўня і пачатак верасня 1941 г. быў для акупаванай Брэстчыны як і для ўсёй Беларусі часам іх тэрытарыяльнага падзелу і адміністрацыйнай рэарганізацыі. Як вынікае з выяўленых дакументальных крыніц, арганізацыйнае афармленне органаў цывільнай адміністрацыі на новазанятых усходніх тэрыторыях пачалося ў адпаведнасці з "Указам фюрэра аб кіраванні на новазанятых усходніх тэрыторыях" ад 17.07.1941 г. [1, с. 186—188]. Адпаведна загаду, па заканчэнні ваенных аперацый занятая тэрыторыя павінна перайсці ад ваеннага ў цывільнае падпарадкаванне генеральных, галоўных і акружных камісарыятаў. Аднак непасрэднае ўключэнне Беларусі ў склад рэйхскамісарыятаў Остланд і Украіны адбывалася на падставе асобных загадаў вышэйшага кіраўніцтва нацысцкай Германіі — "першага" [1, с. 189—190; 2, с. 146—147] і "другога" [1, с. 195; 2, с. 147—148] указаў фюрэра, адпаведна ад 17 ліпеня і 20 жніўня 1941 г. Заўважым, што імі, апрача ўсяго, вызначаліся і новыя тэрытарыяльныя межы, у рамках якіх павінна была праводзіць сваю палітыку так званая цывільная адміністрацыя. Канчатковая лінія падзелу паміж рэйхскамісарыятамі Украіна і Остланд замацоўвалася "на поўночы ад Лунінца—Пінска—Кобрына—Брэста" [1, с. 196].

1 верасня 1941 г. тэрыторыя Брэсцкай і Пінскай абласцей пераходзіць ад ваеннай да цывільнай адміністрацыі, што адразу азначала яе ўключэнне ў якасці паўночнай часткі генеральнай акругі Валынь-Падолія, кіраўніцтва якой да пачатку 1942 г. знаходзілася ў Брэсце [3, с. 166]. На 25 верасня 1941 г. акругу з плошчай каля 20 200 км$^2$ утваралі Брэст-Літоўскі, Давыд-Гарадокскі, Кобрынскі, Маларыцкі і Пінскі гебітскамісарыяты, пад уладай якіх знаходзілася амаль 750 тыс. чалавек ці шостая частка ўсяго насельніцтва і чвэрць усёй тэрыторыі генеральнай акругі [3, с. 165]. Такое адміністрацыйнае палажэнне захоўвалася да 1944 г., калі акругі былі ўключаны ў склад генеральнага камісарыята Беларусь у Мінску з непасрэдным падпарадкаваннем усходнему міністэрству на чале з А.Розенбергам.

Адной з першых была ўтворана Брэст-Літоўская акруга, куды ўваходзілі раёны Брэста, Дамачава і Маларыты. Да канца года ў яе склад перадаюцца яшчэ 2 раёны: Матыкальскі і Жабінкаўскі. Пры гэтым апошні быў выдзелены з Кобрынскай акругі, а Матыкальскі адыйшоў ад акругі Беласток, якая ўваходзіла ў склад усходняй Прусіі [4, k. 001301]. З выяўленых крыніц таксама вынікае, што спачатку існавалі два асобныя камісарыяты Брэсцкі-гарадскі і Брэсцкі-раённы, на чале якіх стаялі немцы, адпаведна, Курт Роле і Франц Бурат. Пасля ліквідацыі гарадскога камісарыяту ў кастрычніку 1942 г. гебітскамісарыят Брэст-Літоўска да канца акупацыі ўзначальваў Ф.Бурат [3, с. 165].

Па стану на 25.09.41 г. у рэйхскамісарыяце Украіна была зацверджана тэрытарыяльная структура генеральнай акругі Валынь-Падолія. Пад пазіцыяй 17 у спісе значыўся гебітскамісарыят Маларыта, куды ўваходзілі тэрыторыі беларускіх і ўкраінскіх раёнаў, адпаведна: Дамачава, Маларыты, Забалоцця, Камень-Кашырскага, Ратна [5]. Адміністрацыйным цэнтрам акругі быў вызначаны горад Маларыта. Гебітскамісарыят Кобрына, кіраваў якім на працягу ўсяго перыяду акупацыі немец Оскар Панцэр, пачаў сваю дзейнасць 3 верасня 1941 г. Спачатку ў акругу ўваходзілі Кобрынскі, Антопальскі, Дзівінскі і Жабінкаўскі раёны [6, Bl. 1]. 1 снежня 1941 г. апошні быў перададзены да Брэст-Літоўскай акругі, у той час як у акругу Кобрын з Пінскай акругі быў уключаны Драгічынскі раён. У студзені 1942 г. адбылося пашырэнне тэрыторыі акругі за кошт Бярозы-Картузскай, выдзеленай з генеральнай акругі Беларусь. З гэтага часу акруга займала тэрыторыю ў 6000 км$^2$ з несельніцтвам у 230 000 чалавек [4, k. 000169].

Выращэнне пытання аб тэрыторыі Пінскай акругі, у склад якой адразу ўваходзілі, апрача самаго Пінска, — Драгічын, Іванава, Любяшоў, Маневічы, Лагішын [6, Bl. 1], адбылося толькі ў канцы 1941 г., калі раёны Лагішына, Леніна і частка раёна Лунінца былі ўключаны ў склад генеральнай акругі Беларусь. Канчатковая мяжа ў гэтым раёне вызначаецца 1.01.1942 г., калі раён Любяшоў выключаецца з Пінскай акругі і адыходзіць да гебітскамісарыяту Камен-Кашырска, а Драгічын — да акругі Кобрын. У выніковай справаздачы гебітскамісара Пінска, які на працягу двух апошніх гадоў акупацыі ўзначальваў Паўль Герхард Кляйн [7, MA 797, k. 000352], адзначаецца, што акруга перайшла ў падпарадкаванне цывільнай адміністрацыі толькі 3.09.1941 г. [6, Bl. 1]. Да гэтага яна знаходзілася пад кантролем мясцовай камендатуры, якая спачатку нават адмаўлялася здаваць свае паўнамоцтвы новаму кіраўніцтву. Аднак і пасля гэтага пытанне з перадачай тэрыторыі акругі заставалася на парадку дня, паколькі амаль што ў гэты ж час у Пінску з'явіліся прадстаўнікі генеральнага камісара ў Мінску — В.Кубэ, які разглядаў Пінск ў якасці аднаго з паўднёвых раёнаў генеральнай акругі Беларусь. Праблема была вырашана распараджэннем рэйхсміністра А.Розенберга, у адпаведнасці з якім Пінская акруга заставалася ў складзе рэйхскамісарыяту Украіна, а мяжа паміж Остландам і Украінай праходзіла ў 10 км на поўнач ад лініі чыгункі Брэст-Літоўск—Лунінец—Гомель [6, Bl. 1].

Частыя рэарганізацыі тэрытарыяльнай структуры паўночнай часткі генеральнай акругі Валынь-Падолія былі выкліканы рознымі прычынамі, у тым ліку і эканамічнымі. Аб гаспадарчым значэнні "паўночна-украінскай" тэрыторыі паведамляе і генеральны камісар у Мінску К.фон Готберг, які пасля ўключэння "паўночна-украінскіх" акруг у склад генеральбэцырка Беларусь дае характарыстыку новай "эканамічнай прасторы": агульная плошча — 6 міліёнаў га, з якіх у сферы сельскагаспадарчых інтарэсаў — 2,8 мільёна га, пад лясной гаспадаркай — 1,7 мільёна га. Уключаныя паўночныя тэрыторыі генеральнай акругі Валынь-Падолія складаюць каля 1,9 мільёна га, з якіх сельскагаспадарчых — 700 000 га і 500 000 — у лясной гаспадарцы [8, Bl. 162].

Разгляд гаспадарчай дзейнасці ваеннай і цывільнай адміністрацый патрабуе звароту да дырэктыўных дакументаў, на аснове якіх "вялася гаспадарка" на новазанятых усходніх тэрыторыях. Як вядома, асновай для арганізацыі гаспадарчай дзейнасці спачатку нарыхтоўчых каманд, эканамічных інспекцый і гаспадарчых каманд, а затым галоўных аддзелаў генеральнай акругі Валынь-Падолія з'яўляліся так званыя "зялёная" і "карычневая" папкі. Аднак калі на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь дзейнічала "карычневая" папка ці частка I "Дырэктыў па вядзенні гаспадаркі" [2, с. 50—60; 160—179], дык на тэрыторыі генеральбэцырка Валынь-Падолія — частка II. Пры гэтым, у дакуменце адзначаецца, што для "паўночнай зоны" (Брэстчыны. — *С.Н.*) рэйхскамісарыята Украіна "дзейнічаюць тыя ж самыя дырэктывы, як і для Беларусі, адкуль традыцыйна можна пастаўляць бульбу для Украіны" [2, с. 174].

Пры разглядзе ваенна-эканамічнай палітыкі Трэцяга Рэйха на акупаванай тэрыторыі Беларусі важна памятаць, што практычна на працягу першага тыдня пасля пачатку вайны для значнай часткі германскага вермахта было наладжана "забеспячэнне з краіны" [9, Bl. 1]. Значную работу ў гэтым напрамку праводзілі эканамічныя інспекцыі, дзейнасць якіх з лета 1941 г. ахоплівала практычна ўсю тэрыторыю Беларусі, у тым ліку і раёны Брэстчыны. У адпаведнасці з загадам фюрэра ад 20 кастрычніка праводзілася новая лінія размежавання паміж ваеннай і цывільнай адміністрацыямі, уключаючы чыгуначную лінію Рэчыца—Лунінец. Аднак пры гэтым эканамічная інспекцыя Украіны не толькі захоўвае свае паўнамоцтвы ў вобласці сельскай гаспадаркі і эканомікі на тэрыторыі ўсяго рэйхскамісарыята, але і пашырае іх з улікам дамоўленасці паміж эканамічным штабам Ост і рэйхскамісарыятам Украіна [10, Bl. 1—2].

Адной з галоўных задач, якая адразу паўстала перад гебітскамісарыятамі пасля пачатку іх дзейнасці, было якраз забеспячэнне вермахта прадуктамі харчавання. Апошняе азначала не толькі нарыхтоўку сельскагаспадарчай прадукцыі, але і аднаўленне яе вытворчасці, асабліва ў святле катэгарычных загадаў ваенна-эканамічнага кіраўніцтва Трэцяга Рэйха аб тым, што з лістапада 1941 г. "вышэйшым законам ваеннай эканомікі"

[11, Bl. 342] павінны стаць патрабаванні па выкарыстанню на захопленых усходніх тэрыторыях менавіта каланіяльных метадаў "гаспадарання", максімальна поўным забеспячэнні вермахта і насельніцтва рэйха неабходнымі прадуктамі харчавання і сыравінай.

Сельскагаспадарчыя ўпраўляючыя, прызначаныя гебітскамісарамі ў кожнай акрузе, бачылі адзін з шляхоў вырашэння гэтай праблемы ў павелічэнні памераў зямельных надзелаў і ў магчымасці іх самастойнай апрацоўкі насельніцтвам у сваіх гаспадарках і былых дзяржаўных маёнтках. З гэтым цывільнае кіраўніцтва звязвала свае планы аб значным узрастанні вынікаў працы ў сельскай гаспадарцы. Ужо восенню 1941 і вясной 1942 г. пасяўныя плошчы ў генеральнай акрузе Валынь-Падолія, у тым ліку на тэрыторыі яе паўночных акруг, складалі ад 80 да 120 працэнтаў у параўнанні з перадваеннымі плошчамі [3, с. 330]. Павелічэнне плошчаў азначала не толькі выкананне нормаў нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, але і ўзрастанне аб'ёмаў яе вытворчасці дзеля ажыццяўлення шырокамаштабнай праграмы рабавання ўсходніх тэрыторый [11, Bl. 342].

Шэраг іншых лічбавых паказчыкаў утрымлівае справаздача Брэст-Літоўскага гебітскамісара за перыяд з 1941 да 1944 гг. Так, на тэрыторыі акругі ў верасні 1941 г. было нарыхтавана: 4453,6 т зерня для памолу на хлеб, 2818 галоў буйной рагатай жывёлы, 996 свіней, 36 авечак, 1244553 л малака [4, k. 001302]. Да ўсяго, да канца 1941 г. была аднаўлена праца ў 46 былых дзяржаўных маёнтках. У 1942 г., як адзначаецца ў справаздачы, галоўная ўвага была накіравана на вытворчасць і нарыхтоўку сельскагаспадарчай прадукцыі. У выніку было нарыхтавана: 9844,5 т зерня для памолу на хлеб, 3720,3 т сена, 5179 т саломы, 2608949 шт. яек, 68458 кур, 685 качак, 1771 гусей, 67 індзюкоў, а таксама 16263 кг воўны, 3879 шт. аўчын, 19846 галоў буйной рагатай жывёлы, 4170 свіней, 8450 авечак, 6028400 л малака, 10500 т бульбы. Пры гэтым у паўднёвую Украіну было адпраўлена 589 коней і 6027 авечак [4, k. 001303]. У 1942 г. была наладжана праца рыбхозаў. Улоў рыбы склаў 208,105 т, пры гэтым яе асноўная частка пастаўлялася вермахту [12, спр. 1043, л. 36].

Агульныя падлікі асобных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі паказваюць, што за тры гады акупацыі на тэрыторыі Брэст-Літоўскай акругі было нарыхтавана: зерня для памолу на хлеб 27000 т, 37528 галоў буйной рагатай жывёлы, 8273 свіней, 16705 авечак, 14032705 л малака, 25058 т бульбы і інш. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ў паўночных раёнах была наладжана значна лепш у параўнанні, напрыклад, з такімі раёнамі, як Маларыта і Дамачава са значнымі плошчамі лясоў і балот. Таму для гэтых раёнаў былі вызначаны паніжаныя лічбы ўраджайнасці: для пшаніцы — 8,70 ц на га, жыта — 9,20, ячменю — 8,40, аўсу — 8,70, бульбы — 80,0, рапсу — 5,60 ц на гектар [13, Bl. 6].

Справаздача гебітскамісара Кобрына ўтрымлівае інфармацыю аб выніках вытворчасці і нарыхтоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў. На тэрыторыі акругі з самага пачатку разам з 43000 сялянскімі гаспадаркамі былі задзейнічаны 93 былыя дзяржаўныя маёнткі. Пры гэтым гадавыя нормы здачы зерня дасягалі 16000 т і 30000 т бульбы [12, спр. 1043, л. 329]. Аднак іх выкананне ўвесь час знаходзілася пад пытаннем, асабліва з узрастаннем актыўнасці партызан у барацьбе супраць акупантаў. У выніку гэтага планы па нарыхтоўцы не былі выкананы: у 1942 г. на 20 працэнтаў, у 1943 г. — на 40 працэнтаў. Як адзначана ў архіўных матэрыялах, за 1941—1944 гг. агульная лічба нарыхтовак магла быць большай па буйной рагатай жывёле — на 20 працэнтаў, конях — каля 40, свіннях — амаль 90 працэнтаў [12, спр. 1043, л. 325]. Параўноўваючы гэтыя лічбы з тымі, якія датычыліся тэрыторыі генеральнай акругі Валынь-Падолія, неабходна адзначыць, што ў пачатку 1943 г. на яе тэрыторыі значна зменшыўся працэнт нарыхтоўкі: па зерню — на 44,7 працэнтаў, па буйной рагатай жывёле — на 52,4, па авечках — на 68, па свіннях — на 47,4 працэнта [14].

За 1941—44 гг. на тэрыторыі Пінскай акругі было нарыхтавана: жыта — 10277 т, пшаніцы — 1341 т, ячменю — 815 т, грэчкі — 324 т, аўса — 3572 т, проса — 112 т, сена — 3763 т, саломы — 3455 т; бульбы — 24549,7 т, птушкі — 62997 шт, яек — 1921 432 шт., мёду — 7, 707 т, воску — 0, 622 т, воўны — 4,1 т, агародніны — 1715,1 т, садавіны — 209, 3 т, свежай рыбы рачной і азёрнай — 153 361, 5 кг, рыбы з прудоў — 57 633,1 кг, засоленай і сушанай рыбы — 17 998 кг, вэнджанай рыбы — 8356 кг; буйной рагатай жывёлы — 53 000 галоў агульнай вагой 12018, 65 т, свіней — 2900 вагой 210, 446 т, авечак — 29913 вагой 553,

717 т і інш. [15]. Цікавым у гэтым сэнсе можа быць матэрыял аб аб'ёмах прадуктаў харчавання, якія пасля іх нарыхтоўкі і ўліку патрапілі да партызан. З агульнай колькасці жыта, нарыхтаванага за перыяд акупацыі ў Пінскай акрузе, як паказана ў справаздачы, партызаны здолелі вярнуць толькі каля аднаго працэнта (99,815 т), проса — 2 (2,405 т), ячменю — 7 (63,574 т), аўса — 14 працэнтаў (531,678 т) (падлікі аўтара. — *С.Н.*), а таксама 6122737 л малака, 199299,12 кг масла, 10860,55 кг сыра, 304336,25 кг тварагу.

З прамысловых вытворчасцей на тэрыторыі акругі найбольш важнай была Кобрынская прадзільна-трыкатажная фабрыка, якая працавала выключна на патрэбы германскага вермахта, выконваючы розныя нарады на выраб прадметаў адзення. Спачатку на вытворчасці было занята ў сярэднім каля 200 чалавек, працуючых уручную, паколькі на фабрыцы мелася толькі некалькі малаэфектыўных вязальных машын. Летам 1943 г. колькасць працуючых павялічылася амаль на чвэрць, прычым практычна ўвесь калектыў складалі мясцовыя жанчыны і дзяўчаты, якія вязалі шкарпэткі, пуловеры, пальчаткі, рукавіцы, шалікі і інш. Увогуле прамысловыя вытворчасці канцэнтраваліся ў Кобрынскай акрузе выключна на заказах вермахта: выраблялісія збруя, сані, падводы, вокны, дзверы і інш. сталярныя вырабы для абсталявання казарм, шыліся кажушкі, валяліся валёнкі, вязаліся пальчаткі. Так, напрыклад, у пачатку 1944 г. сярод 18 нарадаў, якія паступілі на прадпрыемствы Брэста, Пінска, Кобрына і Століна ў рамках выканання спецыяльнай праграмы па забеспячэнню вермахта, палова выконвалася непасрэдна ў Кобрыне [16, Bl. 40].

Разгляд яшчэ больш шырокага спектра вытворчай дзейнасці цывільнай адміністрацыі можна прасачыць на прыкладах з гісторыі акупаванага Пінска, у якім на 20.01.1942 г. была ў асноўным аднаўлена праца прадпрыемстваў метала- і дрэваапрацоўчай прамысловасці, дзе першапачаткова на рамонтных, будаўнічых, апрацоўчых работах было занята амаль 2000 чалавек. Яны працавалі на дзяржаўнай верфі, у ліцейным цэху, на пілармах, мэблевай і фанернай фабрыках [17]. Усе вытворчасці былі падпарадкаваны інспекцыі ўзбраення Украіны і выконвалі заданні выключна для вермахта. Агульную карціну аб структуры вытворчасці гэтага часу дае спіс гебіткамісара. У снежні 1943 г. сярод вытворчасцей акрамя таго згадваюцца: скураная фабрыка, ліцейная і бандарная майстэрні, кавальні, мылаварня, завод па вытворчасці змазкі, рубіроідны і цэментны заводы. Спачатку яны знаходзіліся ў падпарадкаванні гарадскога ўпраўлення па прамысловасці, але ў хуткім часе былі ўключаны ў Пінскае таварыства прадпрыемстваў. На іх працавала ў сярэднім каля 1000 рабочых. Прадукцыя вытворчасці да 95 працэнтаў з'яўлялася заданнем вермахта [18, Bl. 100—102, 103—105].

Пры гэтым з 1942 г. у акрузе пачалося навучанне моладзі з мэтай яе падрыхтоўкі да працы ў розных вытворчых сферах. Колькасць падрыхтаванай моладзі, як адзначае ў сваёй справаздачы гебіткамісар Пінска, лічылася нязначнай: за два гады ўсяго 151 навучэнец прайшоў прафесіянальную падрыхтоўку. Прычынай такой сітуацыі, на думку гебіткамісара, было тое, што з аднаго боку мясцовае насельніцтва да гэтага практычна не мела вопыту падобнай падрыхтоўкі, а з другога — звыш паловы моладзі 1927/28 г. нараджэння было адпраўлена на работы ў Германію [13, Bl. 6]. Увага да рамяства не была выпадковай, а з'яўлялася абавязковай умовай па выкананні шэрагу распараджэнняў, выдадзеных рэйхскамісарам Украіны ў сакавіку 1942 г. і накіраваных на: 1) улік дзеючых і стварэнне новых рамесных вытворчасцей у Украіне; 2) стварэнне рамесных таварыстваў (арцелей); 3) арганізацыю аб'яднанняў рамесных вытворчасцей. Сярод умоў прыёму ў арцелі і рамесныя аб'яднанні быў і ўзроставы паказчык: прымаліся асобы не маладзей за 16 гадоў. Апрача таго, стварэнне арцелей прадугледжвала іх падзел на 3 класы: да першага маглі быць аднесены толькі тыя, хто меў спецыяльную прафесійную падрыхтоўку і арганізатарскія здольнасці самастойна кіраваць прадпрыемствам; другі складалі прафесіянальна падрыхтаваныя спецыялісты; трэці — тыя, хто праходзіў спецыяльнае прафесіянальнае навучэнне. Пры гэтым усе пытанні арганізацыі прафесіянальнай падрыхтоўкі вырашаліся на ўзроўні акружнога ці гарадскога камісарыятаў [19, Bl. 1—3].

Работа лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўкі ў Пінскай акрузе на працягу дзейнасці цывільнай адміністрацыі характарызавалася тым, што кіраванне лясной гаспадаркай

ажыццяўляў не гебітскамісар акругі, а генеральны камісар Валынь-Падоліі. Пры гэтым генеральная інспекцыя акругі кантралявала адразу Столінскую і Камень-Кашырскую акругі. Вядзенне лясной гаспадаркі ў гэтых раёнах азначала іх уключэнне ў хімічную галіну прамысловасці рэйхскамісарыята Украіны. Вынікам такой дзейнасці на працягу ўсяго перыяду з'яўлялася вытворчасць: 39116 кг жывіцы, 80873 кг дзёгцю, 18358 смалы, а таксама 144962 кг драўлянага вугалю, 2515 кг вагоннай змазкі, 26172 кг каніфолі. Цэнтрам збору і перапрацоўкі нарыхтаванай лясной сыравіны быў украінскі горад Луцк [13, Вl. 8].

Беларускае насельніцтва Брэстчыны ў гады акупацыі павінна было здаваць цывільнай адміністрацыі не толькі штогадовыя натуральныя падаткі, але і рабіць значныя грашовыя выплаты ў выглядзе розных страховак. Для арганізацыі гэтага ў Пінскай акрузе 20 кастрычніка 1941 г. была распрацавана спецыяльная стаўка падаходнага і таварнага падаткаў, уведзены падатковыя нормы за карыстанне зямельнымі надзеламі і пашамі. Так, з першага года акупацыі з кожнага двара павінен быў выплочвацца падатак ад 50 да 79 рублёў за карыстанневорнай зямлёй, 25 рублёў — пашамі. Гэтыя два віды падаткаў з'яўляліся "асноўнымі". Да ўсяго, для мясцовага насельніцтва ў адпаведнасці з распараджэннем рэйхскамісара Украіны з 1.01.42 г. уводзілася адзіная сістэма падаткаабкладання на аснове новага пераразліку выплат за зямельны надзел [13, Вl. 2—3]. Па ініцыятыве Пінскага гебітскамісарыята было ўведзена дадатковае страхаванне жывёлы і маёмасці. Аб выніках збору падаткаў і розных паступленняў з 1 верасня 1941 да 31 сакавіка 1944 г. наглядна сведчыць дадатак 1 да выніковай справаздачы гебітскамісара Пінска. На працягу амаль трох гадоў на тэрыторыі акругі было ўведзена і збіралася 19 розных відаў падаткаў і страховак: падатак на набыццё тавараў 27033462,07 рублёў/карбованцаў, падатак за выніковасць працы — 1327762,73, падатак з прыватных прадпрыемстваў — 565727,41, адлічэнні ад прыбытку — 12693781,47, падаходны падатак — 1181594,37, (падаходны) падатак на заработнаую плату — 6467439,55, асноўны падатак — 22647623,63, падатак на пабудовы — 492247,18, падатак на занятак рамяством — 335411,82, арэндны падатак — 5879590,79, падатак на гігіену — 5298772,50, падатак за ашчадаванне заробку — 1615331,52, падатак з'яўрэяў — 2646580,52, падатак на сабак — 539769,00, абшчынны падатак на вёскі — 5576925,64, падатак на кіно — 353650,90, дарожны падатак — 1603250,06, страхоўка — 1944682,01, падатак на швейныя майстэрні — 60853,20, што склала агульную суму ў 98264456,37 рублёў/карбованцаў [15].

Татальны ўлік мясцовай рабочай сілы і месцаў яе выкарыстання з'яўляўся адной з галоўных задач біржаў працы і вярбовачных пунктаў Пінскага гебітскамісарыята, перад якім з 1942 г. паўстала практычна невырашальная праблема аб забеспячэнні мясцовай рабочай сілай усё ўзрастаючых патрэб з боку ваеннай і цывільнай адміністрацый, будаўнічай службы Тодта і галоўнай дырэкцыі чыгунак, службаў галоўнага ўпаўнаважанага па выкарыстанні рабочай сілы і эканамічных інспекцый Цэнтр і Поўдзень і інш. Ад цывільнага насельніцтва, занятага на прымусовых работах, патрабавалі высокай працоўнай адказнасці, дысцыпліны і парадку, выкарыстоўваючы для гэтага розныя формы і метады ўціску — узброеныя паліцэйскі прымус, забойствы, тэрор. Такія сродкі з'яўляліся фактам масавых злачынстваў у дачыненні да мірнага насельніцтва Брэстчыны. Дакладная лічба аб колькасці людзей, занятых ў гады акупацыі ў розных працоўных сферах, у тым ліку — на аднаўленні водных шляхоў, будаўніцтве ўчасткаў чыгунак, прычалаў, мастоў і ромонту дарог, работах на суднаверфі, на сплаве лесу, торфанарыхтоўках і ў лясной гаспадарцы, дрэваапрацоўцы, меліярацыі, на сельскагаспадарчых работах і г.д., — увогуле, адпаведна дакументальным крыніцам, застаецца практычна невядомай. Хаця канкрэтныя факты аб існаванні на акупаванай тэрыторыі Брэстчыны шматлікіх рабочых лагераў і месцаў па прымусовым утрыманні мірнага насельніцтва, яго выкарыстанні ў якасці рабочай сілы, можна сустрэць толькі ў апошні час у даследаваннях айчынных і замежных гісторыкаў.

Такім чынам, навуковы аналіз арыгінальных дакументаў стварае ўмовы не толькі для раскрыцця асобных малавядомых старонак ваенна-эканамічнай гісторыі Брэстчыны ў 1941—1944 гг., але і з'яўляецца асновай для апрабацыі некаторых аўтарскіх высноў:

1) аб важнасці працягу навуковай працы па ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным вывучэнні ўсіх аспектаў ваенна-эканамічнай гісторыі Брэстчыны на аснове правядзення даследаванняў рэгіянальнага кшталту;

2) аб неабходнасці максімальна поўнага выяўлення, апрацоўкі і выкарыстання арыгінальных дакументаў і матэрыялаў, без якіх на сённяшні дзень практычна немагчыма наблізіць айчынную ваенна-гістарычную навуку да сусветнага ўзроўню;
3) аб патрэбнасці рашучага звароту беларускай ваенна-гістарычнай навукі да замежнага вопыту распрацоўкі гісторыі акупацыі Беларусі 1941—1944 гг. скрозь прызму гісторыі паўсядзённасці.


1. "Fuehrer-Erlasse" 1939—1945. Stuttgart, 1997.

2. Новікаў С.Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў. Мн., 2002.

3. Gerlach Ch. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 2000.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь — далей НА РБ, фонд мікрафільмаў, МФ 257.

5. Федэральны архіў Германіі (Берлін), далей — BA, R 94/9, RKU, Generallbezirk Wolynien v. 25.9.41; RW 31/256, Anlage zu III E 145/42g, Karte des RKU v. 05.1942.

6. BA, R 93/14, Erfahrungs- und Raeumungsbericht fuer das Gebiet Pinsk.

7. Архіў Інстытута навейшай гісторыі (Мюнхен), далей — A IfZ, MA 795, 798.

8. BA, R 90/8. Organisationsplan des Reichskommissars fuer die Ukraine, o.D.

9. Федэральны ваенны архіў Германіі (Фрайбург), далей — BA-MA, RW 31/305, Die landwirtschaftlichen Leistungen des besetzten Ostraumes im ersten Wirtschaftsjahr (1.9.1941—31.8.1942).

10. BA, R 93/14, GebK Brest-Litowsk, Taetigkeit und Abschlussbericht des Abt. Witrschaft v. 29. August 1944; Abschlussbericht und kurzer Ueberblick ueber die Taetigkeit des Gebietslandwirtes von August 1941—Mitte Juli 1944.

11. BA, R 6/23, Schnellbrief des Reichsmarschals des Grossdeutschen Reiches V.P. 17064/1 v. 17. Oktober 1941.

12. НА РБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 971, 1043.

13. A IfZ, MA 795: Verwaltungsmaessige Unterstellung der drei nordwolynischen Gebieten Brest-Litowsk, Kobrin, Pinsk. Einschreiben des Reichskommissars fuer die Ukraine v. 26. April 1944.

14. BA-MA, RW 30/155, Taetigkeitsbericht W Wi Aussenstelle Brest-Litowsk v. 25. Mai 1943: Liste der Betriebe GebK Pinsk; Wi In Brest-Litowsk. Kurzbericht v. 8. Juni 1943.

15. BA, R 93/14. Anlage 1: Aufstellung der in der Zeit vom 1.9.1941 — 31.3.1944 im Gebiet Pinsk vereinnahmten Steuern.

16. BA-MA, RH 3/v. 332. Rue In Ukraine. Liste des in ganggesetzten Betriebe. Bericht Aussenstelle 17 v. 20.1.42.

17. BA-MA, RW 30/155. Taetigkeitsbericht W Wi Aussenstelle Brest-Litowsk v. 25.Mai 1943: Liste der Betriebe GebK Pinsk.

18. A IfZ, RMfbO: Schr. Nr. 223 v. 3.6.42: Die Neuordnung fuer Handwerks in der Ukraine.

19. BA, R 93/14. Anlage 2 zu Erfahrungsberichten der Jahre 1941/42, 1942/43, 1943/44 im Gebiet Pinsk.


## ПРАВОВОЕ ПОЛОЖЕНИЕ РЕЛИГИОЗНЫХ КОНФЕССИЙ В ОККУПИРОВАННОЙ БЕЛОРУССИИ (1941-1944 ГГ.)


Э.С.Ярмусик

*г. Гродно, ГрГУ им. Я. Купалы*


Правовой статус религиозных конфессий на оккупированной гитлеровцами территории Белоруссии основывался на важнейших доктринальных положениях нацистской идеологии и политики, предусматривающих господство германской расы над всеми остальными, борьбу за жизненное пространство (Lebensraum) за счет евреев и славян.